УДК 821.161.3-311.3*С. Мінскевіч

Я. М. Батурына

Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт

АПОВЕСЦЬ «ГІПЕРНОВЫ РАБІНЗОН» С. МІНСКЕВІЧА ЯК УЗОР КАСМІЧНАЙ РАБІНЗАНАДЫ

Артыкул прысвечаны аналізу спецыфікі касмічнай рабінзанады ў беларускай прозе на прыкладзе аповесці «Гіпернові рабінзон» С. Мінскевіча. Абапіраючыся на сюжэтную мадэль і генезіс жанру Литературоведение 20 рабінзанады, аўтар спрабуе вызначыць прыкметы гэтай сюжэтнай схемы ў прозе абранага пісьменніка. Зроблена выснова, што беларуская касмічная рабінзанада мае ўласныя асаблівасці, сярод якіх – геаграфічная канкрэтызацыя, акцэнт на нацыянальных пытаннях, прывязка да пэўных гістарычных падзей.

Касмічная рабінзанада ўяўляе сабой адносна новую разнавіднасць вядомай ад Д. Дэфо сюжэтнай мадэлі і яднае прыкметы фантастычнай і навукова-папулярнай літаратуры. Твораў, дзе ў якасці адасобленай прасторы выступае іншая планета ці касмічны карабель, а герой-рабінзон з‘яўляецца астранаўтам, у сусветнай літаратуры становіцца ўсѐ больш. У айчынным мастацтве слова прыкладам касмічнай рабінзанады можа служыць аповесць С. Мінскевіча з красамоўнай назвай «Гіпернові рабінзон». Эпіграф да твора, узяты з самай вядомай рабінзанады Д. Дэфо, выконвае прагнастычную функцыю, прадказвае гісторыю вымушанай адзіноты і глыбокага смутку героя і абвяшчае магчымы трагічны канец, які яго чакае: «…я меў усе падставы зрабіць выснову, што гэтак было наканавана небам, каб тут, у журботным месцы, у безвыходным смутку адзіноты, я і скончыў свае дні… Даніэль Дэфо» [1, с. 203]. Герой Д. Дэфо, застаўшыся на самоце, прыйшоў да высновы аб фатальнасці ўласнага жыцця, прадказанай наканаванасці ўсіх яго этапаў. Верагодна, персанажа аповесці С. Мінскевіча чакае аналагічнае прасвятленне. Твор пачынаецца з апісання шараговага дзяжурства навукоўцаў на касмічнай станцыі. Падчас назірання здараецца нечаканае: за бортам яны вылоўліваюць бутэльку «Зуброўкі». «Толькі як яна, халера, апынулася тут, за чатырыста тысяч мільѐнаў кілямэтраў ад Зямлі?» [1, с. 203], – здзіўляюцца астранаўты. Так чытач даведваецца, што дзеянне адбываецца ў глыбокім космасе. Вывучэнне знойдзенага аб‘екта паказала, што «падчас свайго касмічнага падарожжа бутэлька набрала даволі вялікую дозу радыяцыі. Яе змясцілі ў адмысловы адсек, прасвятлілі рэнтгенам… У ѐй знаходзіліся аркушы паперы з тэкстам, напісаным ад рукі на дзвюх мовах. Дакладней, на дзвюх з паловаю: на беларускай, рускай, а некаторыя словы перакладаліся над радком на мове, падобнай да ангельскай» [1, с. 204]. Вобраз бутэлькі, знойдзенай у моры, вельмі распаўсюджаны як у авантурнапрыгодніцкай літаратуры ў цэлым, так і ў рабінзанадах у прыватнасці. Такім спосабам сувязі героі, што пацярпелі караблекрушэнне і 21 апынуліся ў ізаляцыі на незаселеным востраве, спрабавалі паведаміць пра сябе, катастрофу, у якую трапілі, і, магчыма, спадзяваліся дачакацца дапамогі, каб выбрацца з пасткі адзіноты і ізаляцыі, у якой апынуліся па аб‘ектыўных прычынах. С. Мінскевіч пераносіць шырокавядомы вобраз «паслання ў бутэльцы» ў прастору мора касмічнага. Лісток паперы, які знайшлі даследчыкі, уяўляе сабой зварот зямляніна-беларуса Святаслава Міхаіла Лунцэвіча да ўсѐй планеты і аповед пра неверагодную гісторыю, у якую ѐн трапіў. Акрамя таго, тэкст пісьма сведчаць, што пафас і трывога апавядальніка датычацца гістарычнага і сацыяльнага лѐсу беларускага народа, прадстаўніком якога і з‘яўляецца Лунцэвіч: «І яшчэ, няхай гэтае гістарычнае пасланне выканае і місію напаміну, што на Зямлі існуе (існаваў) народ БЕЛАРУСЫ, з прадстаўніком якога й здарыліся неверагодныя падзеі» [1, с. 205]. Як бачым, першая адметнасць беларускай касмічнай рабінзанады – акцэнт на нацыянальным пытанні. Аповед персанажа вызначаецца канкрэтыкай і яснасцю, строгім храналагічным выкладам падзей, што з‘яўляецца характэрнай рысай класічнай рабінзанады: «25 студзеня 1992 году я ў сваѐй кватэры нумар 77 дома 78 па вуліцы Ангарскай у горадзе Менску, як звычайна, лѐг спаць аб 11-й вечара» [1, с. 205]. Аднак самі падзеі, пра якія распавядае мужчына, не рэалістычныя, як таго патрабуе традыцыйная сюжэтная схема, а

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

характэрныя хутчэй для фантастыкі пра тэорыю змовы і тайныя эксперыменты іншапланецян: «Раптам сярод ночы я прачнуўся ад незвычайнага адчування бязважкасці ў сваім целе, а потым (я думаў, што гэта ў сне) мой пакой пачаў падаўжацца, выцягвацца, быццам кропля, унутры якой я ляжаў на сваѐй тахце. Пасля сцяна, акно, шафы расплыліся ўшыркі й ператварыліся ў вялізную прасторавую ўлонку» [1, с. 205]. Як бачым, Лунцэвіч трапляе ў адасобленую прастору, не прадпрымаючы ніякіх актыўных дзеянняў. Ён не выпраўляецца ў рызыкоўнае падарожжа, як тое робяць персанажы навуковапапулярызатарскіх ці педагагічных рабінзанад, не ўцякае ў незаселенае месца, баючыся пераследу, як героі сацыяльнапалітычнай разнавіднасці гэтай сюжэтнай мадэлі, ѐн мірна спіць у сваѐй кватэры. Святаслаў падрабязна апісвае зданяў, з якімі сустрэўся ў начным небе: «Тры паўпразрыстыя постаці знаходзіліся насупраць мяне. Іх целы нагадвалі чалавечыя» [1, с. 205]. Безумоўна, прышэльцы маюць уласныя мэты, і прычына, па якой яны звязаліся з прадстаўніком чалавецтва, – правядзенне так званых «інфармацыйных сеансаў», што быццам бы не нясуць пагрозы жыццю Литературоведение 22 і здароўю Лунцэвіча. Аднак далейшыя адносіны (дакладней, іх адсутнасць) з іншапланецянамі разгортваюцца не так пазітыўна. Пасля праведзенага гіпнатычнага сеанса герой не вярнуўся дадому, а быў замкнѐны прышэльцамі ў адзіноце сярод непрагляднай імглы. На яго думку, для правядзення далейшых даследаванняў. Відавочна, што герой С. Мінскевіча апынуўся ў ізаляцыі і стаў «рабінзонам» не па ўласнай волі ці з прыкрага збегу абставін (бура, караблекрушэнне, авіякатастрофа і пад.), а па прычыне мэтаскіраваных дзеянняў трэціх асоб. Прычым Святаслаў пазбаўлены і ілюзіі выбару, які прадстаўлены нават персанажам сацыяльна-палітычных рабінзанад. Усведамленне гэтага факта выклікала ў Лунцэвіча буру эмоцый, у першую чаргу, жах, злосць, паніку ад невядомасці і непрадказальнасці ўласнай будучыні, а таксама ад адзіноты ў зняволенні. Апынуўшыся ў стане небяспекі, герой адчувае сябе загнаным у кут, жывѐлай, якую зачынілі ў клетцы. Таму не дзіўна, што паводзіны яго нагадваюць звярыныя, першабытнаінстынктыўныя: «несвядома, нібы ў шалѐным прыпадку, біў кулакамі адзінае, што мог біць, адзінае, што мог адчуваць, – тахту. Гэта, мусіць, і выратавала мяне ад поўнай прастрацыі. Я стаміўся фізычна, зваліўся на родную, мілую тахту, залез пад коўдру і моцна замружыў вочы» [1, с. 208]. Тыповым для твораў-рабінзанад з'яўляецца матыў крызісу, душэўнага надлому героя, пераасэнсаванне ім уласных поглядаў і прынцыпаў у выніку знаходжання сам-насам у замкнѐнай прасторы. Персанаж С. Мінскевіча таксама перажывае ўсе стадыі такой метамарфозы. Сітуацыю пагаршае navakольная цемра, немагчымасць бачыць межы адведзенай яму вязніцы. Спачатку вымушаная ізаляцыя, адсутнасць кантакту з іншымі асобамі выклікае ў Святаслава сумненні ва ўласнай адэкватнасці, але пасля ѐн разважае наступным чынам: «Бурыя даўгія языкі манатонна лізалі замкнѐную прастору вакол мяне, як быццам я сам, асоба, чалавек, зменшаны, сціснуты ў макавае зернейка, закінуты ў цэнтар свайго мозаку, назіраю знутры ягонае хваравітае перараджэнне» [1, с. 209]. У выніку, як і герой твора Д. Дэфо, пасля таго, як схлынула хваля першай панікі і жаху, персанаж С. Мінскевіча пачынае разважаць лагічна і рацыянальна, ва ўсялякім разе спрабуе гэта зрабіць. Наступным крокам героя ў зняволенні становіцца вывучэнне і разведка адведзенай яму ізаляванай прасторы. Менавіта так дзейнічаў і Рабінзон Круза на сваім востраве. Для Лунцэвіча, які апынуўся ў вымушанай ізаляцыі ў невядомай прасторы, як і для герояў многіх іншых рабінзанад, сацыякультурныя 23 праблемы адыходзяць на другі план, а першачарговымі становяцца праблемы фізіялагічныя, праблемы выжывання, і перш за ўсѐ голад. Каб жыць, неабходна есці, і гэтая простая ісціна хутка «даходзіць» да зняволенага іншапланетнай турмы, удзельніка страшнага эксперыменту: «Я нечакана адчуў голад, аж уваччу пазмрачнела. Аднак я першы раз у сваім жыцці ўзрадаваўся голаду. Мае турэмнікі павінны ведаць: мне неабходна есці» [1, с. 210]. Як і Рабінзон Д. Дэфо, вырашыўшы праблему харчавання, Лунцэвіч пачынае перарабляць акаляючае асяроддзе пад свае практычныя патрэбы: вынаходзіць і стварае новыя прадметы, змяняе тыя, што ўжо маюцца: «З бляшанак, матузка й ножак змайстраваў складаную прыладу, накшталт пад'ѐмніка, але мэханізм не хацеў працаваць. Найлепшае, што я зрабіў за той пэрыяд, – нож з жалезнага клямара, які служыў для адкідання матраца; а з пустых бляшанак – прыстасаванне для кандэнсацыі вадзяной пары з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вільготнага паветра маѐй каморы (выходзіла ледзь не траціна шклянкі за дзень). Такім парадкам я займеў зброю і забяспечыў сябе вадой» [1, с. 212]. Небяспечныя сітуацыі, пагроза здароўю і жыццю, знешнія ворагі – неад‘емныя атрыбуты твора-рабінзанады. Персанаж С. Мінскевіча таксама сутыкаецца з выявай смерці, што выклікае ў яго пачуццѐ жаху і жаданне збегчы. Сутыкненне з загінуўшымі прышэльцамі і далейшыя развагі пра гэты трагічны выпадак прыводзяць Лунцэвіча да нечакана жудасных высноў і перакульваюць разуменне свайго становішча з ног на галаву – з ахвяры ў забойцу. Ён, нарэшце, разгадвае таямніцу, высвятляе прычыны свайго раптоўнага зняволення: «Усѐ стала на сваѐ мейсца! Яны хаваліся ад маіх думак! А значыць, і ад майго сну! Дзве пары дзвярэй і маленькі пакойчык перад маѐй ―спальняй  нагадвалі шлюз, а пакінутыя якраз на мяжы дзіравыя пантоплі і не дазволілі яму як след спрацаваць. Мой сон пранік у ―нябесную залю  і забіў безабаронных істотаў. Сон-забойца!» [1, с. 217]. Страшэнны сон-фантасмагорыя галоўнага героя становіцца той небяспечнай зброяй, якая прывяла да смерці іншапланецян, да аварыйнага стану іх тэхніку і, як вынік, да яго вымушанага зняволення. Кола замкнулася, змяя Ураборас злавіла свой хвост. Святаслаў зразумеў, што сам ненаўмысна вінаваты ў сваім трагічным становішчы. Нават не ѐн канкрэтна, а тыя горкія і страшныя старонкі гісторыі беларускага народа, што ўсплылі ўрыўкамі ў яго Литературоведение 24 падсвядомасці. У сне адсутнічаюць канкрэтныя асобы і апісанні падзей, даты, аднак на асацыятыўным узроўні чытач разумее, што гаворка ідзе пра вайну, хутчэй за ўсѐ Вялікую Айчынную (герой у творы снедае пасляперабудовачнымі кансервамі, таму такі вывад уяўляецца храналагічна верагодным). Гэты сюжэтны паварот накіроўвае рэчышча твора ў бок сацыяльна-гістарычнай праблематыкі, закранае трагічныя старонкі беларускай гісторыі: «Мусіць, усе мы нясѐм у сабе пакуты сваіх продкаў, як шнары памяці…» [1, с. 217]. Такі падыход, безумоўна, яднае аповесць «Гіперновы рабінзон» з творамі гістарычнага напрамку, а дакладней – гістарычнай рабінзанады, хаця «падарожжа» тут адбываецца толькі ў анейрычнай рэальнасці (у сне). Герой рамана С. Мінскевіча, па сутнасці, праходзіць так званыя пяць стадый прыняцця гора, апісаныя ў псіхалогіі (мадэль Э. КюблерРос): адмаўленне, гнеў, кампраміс, дэпрэсію, пакору. Усведамленне Лунцэвічам таго, што ѐн сам прычына ўласнага зняволення, стала безумоўным і вялікім шокам, за якім, што лагічна, наступіла дэпрэсія: «Тры дні я пракачаўся на сваѐй тахце ў апатыі. Потым дапіў ―Зуброўку  і думаў, як лепей пазбавіць сябе жыцця. Апошняя кропля гарэлкі й пустая бутэлька нагадалі мне звычай пацярпелых караблекрушэнне маракоў» [1, с. 218]. Для праходжання ўсіх крокаў працэсу прыняцця непапраўнага псіхолагі звычайна адводзяць чалавеку прыкладна год. Аднак стрэсавая сітуацыя турэмных умоў і адсутнасць дастатковай колькасці ежы скарацілі для героя гэтыя тэрміны да некалькіх дзѐн. Моц духу Святаслава ўсѐ ж такі перамагае, і мужчына вырашае пакінуць хоць-які значны след на Зямлі для іншых. Намаганні героя не засталіся без узнагароды, лѐс не пакінуў яго аднаго без пуцяводнага маяка – душы маладой дзяўчыны, Блакітнай зоркі, чыѐ «створанае інфармацыйна-энэргетычнае цела БЕЗАБАРОННАЕ супраць уздзеяння думак НЯНАВІСЦІ І ЗЛОСЦІ» [1, с. 221]. Такі фінал твора нясе прамы гуманістычны і міратворчы пасыл, сцвярджае агульначалавечыя каштоўнасці. Цікавая прысутнасць у касмічнай рабінзанадзе біблейскіх матываў. Па іроніі аўтарскай задумы, маладая дзяўчына, душа Бірузовай зоркі, – суседка галоўнага героя ў былым жыцці. Як міфалагічныя Адам і Ева ў Эдэмскім Садзе, ізаляваныя ад астатняга свету, з чыстымі помысламі і душой, яны пражылі мужам і жонкай той невялікі адрэзак часу, што быў ім адведзены. Атрыманае ад Лунцэвіча касмічнае паведамленне прымушае каманду даследчага карабля зазірнуць унутр сябе, аднак людзі будучага не робяць неабходных высноў, бо чалавечая сутнасць не 25 мяняецца за тысячагоддзі. Першасны парыў выратаваць касмічных Адама і Еву разбіўся аб сцяну індывідуальных грахоў кожнага: «Курс ранейшы, – загадаў альбо сцвердзіў капітан. – Калі Джым ня можа. А мы… Ці нашмат мы змяніліся… пасля XX стагодздзя?» [1, с. 223]. Пытанне, якім С. Мінскевіч скончыў сваю аповесць, прымушае не толькі спачуваць яго героям, але і звярнуцца да асэнсавання глыбокіх праблем чалавечай натуры і цывілізацыі. Такім чынам, жанр касмічнай рабінзанады, прадстаўлены ў айчыннай літаратуры аповесцю «Гіперновы рабінзон» С. Мінскевіча, сваімі асаблівасцямі блізкі таксама да гістарычнай рабінзанады. Твор С. Мінскевіча

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мае шмат алюзій і адсылак да класічнага рамана Д. Дэфо «Рабінзон Круза» і захоўвае прыкметы класічнай рабінзанады: выпадзенне героя ў чужароднае бязлюднае асяроддзе, паступовае асваенне незнаѐмай прасторы для паляпшэння ўмоў існавання, душэўны крызіс героя і яго пераадольванне, храналагічнасць выкладу падзей, дакладнасць і скрупулѐзнасць апісанняў кожнага кроку рабінзона, яго псіхалогія. Разам з тым у творы відавочныя рысы, не ўласцівыя сусветнай традыцыі касмічнай рабінзанады: геаграфічная канкрэтызацыя, акцэнт на нацыянальных пытаннях, прывязка да пэўных гістарычных падзей і паказ іх уплыву на свядомасць чалавека. Твору С. Мінскевіча ўласціва моцная гуманістычная скіраванасць, разгляд лѐсу асобнага героя ў кантэксце цывілізацыйных праблем. Спіс літаратуры 1 Мінскевіч, С. Сад замкнѐных гор / С. Мінскевіч. – Мінск: Галіяфы, 2011. – 264 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ